Інфармацыя
ДУК “Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу”
аб метадычных выданнях

| Месяц, калі выдадзены | Вокладка (фота) | Назва метадычнага выдання, анатацыя, адказны за выпуск, кантакты |
|---|---|---|
| Люты 2026 г. | <br> | У лютым 2026 г. выдадзены зборнік матэрыялаў «Лакальныя традыцыі прыгатавання страў з таркаванай бульбы (бабка, бульбяныя бліны, дранка і іншыя) на Іўеўшчыне».<br>Асаблівае месца ў зборніку адведзена носьбітам гэтага элемента нематэрыяльна-культурнай спадчыны – жыхарам раёна, якія праз пакаленні беражліва захоўваюць і перадаюць унікальныя тэхналогіі прыгатавання традыцыйных страў. У выданні змешчаны звесткі пра майстроў кулінарнай справы, іх асабістыя гісторыі, а таксама пакрокавыя апісанні лакальных рэцэптаў, што складаюць самабытны культурны код рэгіёна.<br>Матэрыялы зборніка накіраваны на:<br>- захаванне і папулярызацыю жывой нематэрыяльнай спадчыны Іўеўскага краю;<br>- прыцягненне ўвагі моладзі да народных вытокаў і пераемнасці традыцый; |

| | | |
|---|---|---|
| | | - умацаванне рэгіянальнай ідэнтычнасці праз папулярызацыю традыцыйнай кухні.<br>Зборнік выдадзены з мэтай метадычнай падтрымкі супрацоўнікаў культуры, а таксама для далейшага выкарыстання ў адукацыйных і турыстычных праектах, накіраваных на папулярызацыю багатай культурнай спадчыны Іўеўшчыны.<br>Адказны: Паляк В.В. (80159568004) |
| Май 2026 г. |  | Зборнік сцэнарных матэрыялаў падрыхтаваны па выніках аднайменнага конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі. Выданне прысвечана знакавай даце: 80-годдзю перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.<br>У зборнік увайшлі лепшыя творчыя распрацоўкі і сцэнарыі мерапрыемстваў аддзелаў і філіялаў ДУК «Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу». Гэтыя матэрыялы сталі вынікам пошукавай і творчай працы, накіраванай на:<br>- ушанаванне памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны;<br>- выхаванне ў маладога пакалення пачуцця гонару за сваю краіну і яе гісторыю;<br>- умацаванне сувязі паміж пакаленнямі праз перадачу духоўнага і гістарычнага |

| | | |
|---|---|---|
| | | вопыту ад ветэранаў і сведак падзей сучаснай моладзі.<br>Зборнік сцэнарных матэрыялаў «Сильна Беларусь связью поколений» выдадзены з мэтай сістэматызацыі і папулярызацыі лепшага вопыту работы ўстаноў культуры па патрыятычным выхаванні. Выданне прызначана для метадычнай падтрымкі работнікаў культуры, педагогаў і арганізатараў маладзёжнага вольнага часу пры правядзенні дзяржаўных святаў і мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці.<br>Адказны: Паляк В.В. (80159568004) |

| | | |
|---|---|---|
| Люты 2026 г. | <br> | Выданне прысвечана адметнай каляднай традыцыі Гродзеншчыны, якая пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 29.05.2024 № 72 ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.<br>Буклет знаёміць з лакальнымі асаблівасцямі абраду, які бытуе ў аграгарадках Ліпнішкі і Трабы, а таксама ў вёсцы Сцігане, дзе ён беражліва перадаецца з пакалення ў пакаленне. У выданні прадстаўлены:<br>- гісторыка-культурны кантэкст: апісанне абраду калядавання, падчас якога ўдзельнікі, пераапранутыя ў трох каралёў Каспара, Мельхіёра і Бальтазара, абыходзяць двары з віншаваннямі і дарамі;<br>- музычная спадчына: тэксты традыцыйных народна-рэлігійных песень (у прыватнасці, «Дзісяй в Бэтлеем»), якія выконваюцца падчас свята;<br>- жывая памяць: этнаграфічныя ўспаміны жыхароў раёна аб правілах і асаблівасцях святкавання ў мінулыя часы (напрыклад, аб прыярытэтнасці наведвання дамоў, дзе былі дзяўчаты на выданні). |

| | | |
|---|---|---|
| | | Выданне буклета «Традыцыі свята “Тры каралі” на Іўеўшчыне» накіравана на захаванне і папулярызацыю нематэрыяльнай спадчыны рэгіёна, а таксама на актыўнае прыцягненне моладзі да падтрымкі народных звычаяў. Матэрыялы прызначаны для краязнаўцаў, супрацоўнікаў устаноў культуры і ўсіх, хто цікавіцца духоўнай культурай Іўеўскага краю.<br>Адказны: Айкян Л.В. (80159568004) |

Айкян 68004